ларусі. – Мн. : НКП Беларусі, 2002–2005. Летапіс друку Беларусі : дзярж. бібліягр. паказ. / Нац. кн. палата Беларусі. – Мн. : НКП Беларусі, 2005. – Штомес. Кніжны летапіс. Летапіс нарматыўна-тэхнічных, тэхнічных дакументаў і выданняў вузкага прызначэння. 2005, № 1-12.

5. Здесь и далее приводятся название издающей организации и год издания. Для сборников, изданных в Минске, место издания не указывается.

6. Положение о порядке распространения правовой информации в Республике Беларусь : утв. указом Президента Респ. Беларусь, 01.12.1998 № 565 // Сборник действующих нормативных правовых актов Президента Республики Беларусь, 1994–2000. – Мн., 2001. – С. 291.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# БЕЛАРУСКАЯ КНІГА ПАЭЗІІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ ВЫДАВЕЦТВА "МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА" (2003–2005 ГГ.)

***Барысюк Таццяна Пятроўна,*** *малодшы навуковы супрацоўнік аддзела ўзаемасувязей літаратур Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*

Выдавецтва "Мастацкая літаратура" выпускае кнігі паэзіі для дзяцей даўно, патрабавальна ставячыся да зместавай глыбіні, яскравай выяўленчасці вершаў, да іх ілюстравання шматколернымі, экспрэсіўнымі малюнкамі. З акрэсленага перыяду прааналізуем кнігі М. Чарняўскага, В. Зуёнка, У. Марука, А. Пісьмянкова, У. Паўлава, В. Лукшы, К. Жука, А. Каско, А. Данільчык, звяртаючы асаблівую ўвагу на самыя цікавыя вобразы, нетрывіяльныя сітуацыі, падгледжаныя ці прыдуманыя аўтарамі, жанры, асноўную тэматыку, творы, якія могуць мець вялікае пазнавальнае і выхаваўчае значэнне для дзяцей.

У вершах з кнігі "На каго сварыўся гром" (2003) Мікола Чарняўскі дакладна і яскрава апісвае дзіцячыя характары, што спалучаюць станоўчыя і адмоўныя рысы. Аўтар сімпатызуе сур'ёзнасці хлопчыка, які думае пра сваю прафесійную будучыню, хоча стаць маракам ("Душа ў палоску"). Станоўча ацэньваецца любоў да працы, жаданне дапамагаць дарослым ("Майстры", "Чарадзейныя пруткі", "Буль-буль-суп"). Плённасць працалюбства, калектыўнай дзейнасці паказваецца праз вобразы птушак-крумкачоў ("Плёў кашы крумкач стары...") і інструментаў: "Працуе дружная сямейка: / Рыдлёўка, / Граблі, / Лейка" ("Дружная сямейка") [1, с. 47]. Крытыкуюцца гультайства, нежаданне добрасумленна вучыцца ("Лынды-шлынды", "Дзе пяцёркі прадаюцца?"), апантанасць мультфільмамі замест падрыхтоўкі хатніх заданняў і спартыўных гульняў з сябрамі на вуліцы ("Жахлівы сон"). Аўтар іранізуе з дзіцячай балбатлівасці ("Непаслухмяны язык"), піжонства ("Рэкламныя штаны"), адпрасаванай

сукенкі, але пакамечаных кніжак (“Натка-складка”), выхвалення, не падмацаванага сапраўднымі поспехамі (“Чэмпіён”), неахайнасці падчас спажывання ежы («“Модны” ў Сані пінжачок...»), жадання пастаянна чымсьці мяняцца (“Санёк-мянёк”), заўсёднай незадаволенасці і пакрыўджанасці (“Насупа”), стварэння вэрхалу ў кватэры пры навядзенні парадку (“Борка і ўборка”), баязлівасці (што пчолы пакусаюць) (“Цымбалы”). Паэт сімпатызуе дзіцячым марам – Мікітаваму жаданню катацца на коніку (“На воблачку гнядым...”), дзіцячай дапытлівасці і назіральнасці (“На каго сварыўся гром?”, “Хто сябруе з добрым днём?”). Займальнае апісанне М. Чарняўскім дзён тыдня і месяцаў года (нізка “Сеў аўторак у аўто...”) мае пазнавальнае значэнне для дзяцей.

Васіль Зуёнак у кнізе “Рэха” (2003) апісвае навакольную прыроду ў вобразах, цікавых і зразумелых дзецям. Сярод самых запамінальных – сонечны зайчык, які абуджае ўсё жывое ад сну (“Лясны будзільнік”), суніцы, падобныя да знічак (“Зоркі выпалі ў бары”), ручаёк, утвораны хмаркай і ветрам (“Ручаёк”), дожджык-грыбасей (“Дожджык”). Паэт яскрава апісвае птушак, іх звычкі і галасы, што спрыяе засваенню дзецьмі звестак пра прыроду: “І грак – да пятаў чорны фрак”, “І пліска – з хвосцікам-мігалкай”, “Сарока – скарбніца сакрэтаў”, “І ўдод – чубаты капялюш”, “Зязюля – па сям’і плакуля”, “Снягір з чырвонаю манішкай”, “Сава з прафесарскім аблiччам” (“Пытанне карціць: Хто ў вырай ляціць? – Адказ даецца: Хто застаецца...”) [2, с. 19–21]. Аўтар вучыць дзяцей адрозніваць у лесе ядомыя і неядомыя грыбы (“Грыбная кніжка”) і лічыць да дзесяці (нізка “Лічэбнік, розуму лячэбнік”). Прыводзіць цікавыя здарэнні з жывёламі і птушкамі – як слон паляцеў (“Узмахнуў вушамі слон...”), незвычайныя падзеі ў іх жыцці – конкурс самадзейнасці ў пеўняў (“Песня”), паказвае стасункі між імі: драпежнасць ката і самаахоўнасць шпака (“Не падружацца ніяк...”). Аўтар высмейвае гультайства (“Хату будзе воўк стаўляць...”), вучыць малога Юзю, што ўлетку на вёсцы трэба не толькі есці і спаць, але і працаваць, ратуючы агарод ад пустазелля, а потым з іншымі дзецьмі гуляць у футбол і купацца (“Будзем сілы набірацца!”), ухваляе працавітасць і жаданне дапамагаць дарослым (“Зарадка”). Асуджае дзіцячую сквапнасць, нежаданне дзяліцца санкамі (“Капані”), балбатлівасць (“Два браты”), плаксівасць (“Плаксамер”), палахлівасць (“Пасяліўся...”), фантазёрства (“Хочаце верце, хочаце не”). Сцвярджае, што дзеці растуць пад дажджом, як грыбы (“Як расцём”). Распавядае незвычайную гісторыю пра хлопчыка, які захацеў стаць мядзведзем, як даведаўся, што гэты звер вельмі дужы, ніколі не мыецца, спіць усю зіму, носіць цёплае футра, ласуецца малінамі і мёдам (“Як дазнаўся...”). Напісаў вершаваныя загадкі пра раслінны і жывёльны свет Беларусі, якія могуць быць займальным матэрыялам да заняткаў па прыродазнаўстве ў дзіцячых садах і ў пачатковай школе.

Кніга Уладзіміра Марука “Чыж вярнуўся з-за мяжы” (2003) мае жанравызначэнне “вершаванае падарожжа”. Чыж-патрыёт накіроўваецца ў вандроўку па Еўропе (Францыя, Аўстрыя, Грэцыя, Італія,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Іспанія), Афрыцы, Амерыцы, Антарктыдзе, Аўстраліі, Азіі (Кітай, Індыя) і вяртаецца праз Расію ў Беларусь. Аўтар стварае вясёлыя сітуацыі, з гумарам абыгрывае фанетычнае падабенства слоў (Атава – сталіца Канады і атава – трава, Штраус – кампазітар і страус – птушка, Сена – рака ў Францыі і сена з поля). Кніга карысная не толькі пазнавальнымі звесткамі па айчыннай і замежнай геаграфіі, краязнаўстве і культуры, але і для патрыятычнага выхавання дзяцей, што вельмі важна для далейшага лёсу Беларусі: “Ёсць на свеце прыгажосць, / Але там ты – / Толькі госць. / Дома хто ты? / Гаспадар!” (“На развітанне”) [3, с. 93].

У кнізе “Мы з братам” (2003) Алесь Пісьмянкоў вучыць дзяцей шанаваць сваіх продкаў (“Мы – беларусы”), рана ўставаць і брацца за працу (“Залатое сонейка”), любіць яе (“Рыбак”, “Грыбнікі”), берагчы кнігі (“Саўка ды Грышка”), есці карысную для страўніка ежу, а не прысмакі (“Ласуны”), адпачываць пад музыку (“Цымбалы”). Аўтар здагадваецца, што сніцца дзецям (“Хітрун”, “Сны”), іранізуе над сяброўствам з-за наяўнасці ў дзіцяці веласіпеду ці самакату (“Уладар веласіпеда”, “Кавалеры”). Хлопчык зайздросціць бацьку і дзеду, што тыя самі рашаюць, куды ім ехаць, і лічыць, што такі дазвол на самастойнасць ім даюць вусы (“Зайздрасць”). Дзіця не можа вырашыць праблему: “Без марожанага / Гіну. / А з марожаным – / Ангіна” (“Як быць?”) [4, с. 16]. У вершы “Два браты” хлопчыкі мараць пра сястрычку, якую б яны не білі, а любілі.

У кнізе “Згадка на дабро” (2004) Уладзімір Паўлаў наглядна-вобразна паказвае дзіцячыя заганы: непаслухмянасць дарослых (“Не паслухаў”), нежаданне класціся спаць своечасова (“Лялькі”), няўмельства гарадскога ўнука пасвіць кароў (“Гарадскі”), “яканне” у адказ на пытанні, хто зрабіў добрыя справы, з замоўчваннем дрэнных учынкаў (“Якалы”), вонкавае прыбіральніцтва, калі прадметы закідаюцца за/пад мэблю (“Чысцёха”), абазнанасць у камп’ютэрных гульнях пры непісьменнасці ў сшытках (“Дасведчаны”). Арыгінальныя забаўлянкі-пазнаванкі (аўтарскае жанравызначэнне), якія можна было б назваць “няпраўдзівымі вершамі з каментарамі-праўкамі”, калі дзецям трэба ў чатырохрадкоўі знайсці адну ці некалькі памылак, якія ніжэй аўтар называе і тлумачыць. Напрыклад: “Нас цямнота не скарыла – / Кнігі друкаваў Скарына. / Фёдараў і Пётр Мсціславец / Паспрыялі нашай славе.

– Кнігі спачатку перапісваліся ад рукі. Рабілі гэта Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Мікола Гусоўскі... Потым людзі вынайшлі друкарскі станок.

– Хто былі нашы першадрукары?

– Згаданыя ўжо нашы землякі Францішак Скарына, Іван Фёдараў – яго сапраўднае прозвішча Хведаровіч, - Пётр Мсціславец, Сымон Будны, браты Мамонічы...

– Браты Мамонічы ў 1593 г. у Вільні выпусцілі і адзін з першых беларускіх буквароў” (“Кнігі”) [5, с. 34].

Прыведзенае тут вершаванае чатырохрадкоўе для распрацаванага аўтарам жанру – выключэнне ў тым, што яно без памылак, унізе



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

проста даецца больш падрабязная інфармацыя пра спісы і друкаванне першых кніг. Аўтарам напісана шмат вершаваных загадак, якія выхоўваюць у дзяцей кемлівасць, вучаць суадносіць вобразныя іншаказанні з ведамі пра навакольны свет. Гэтым мэтам адпавядае і загадка пра кнігу: "Пасля таты, пасля мамы / І людзей старэйшых / Яна ваш дарадца самы, / Самы наймудрэйшы" [5, с. 59].

Патрыятычным пафасам кніга "Адзіны ў свеце край" (2004) Валянціна Лукшы блізкая аналізаванай тут кнізе У. Марука: "Якой бы пекнатой ні чаравала / Далёкая дарога позірк мой – / Я ведаю: / Ў вандроўках не ставала б / Святла маёй Айчыны дарагой" ("Адзіны ў свеце край") [6, с. 7]. Аўтар любіць апісваць дзіцячыя забавы ("Арэлі", "Каток", "Санкі"), у прыватнасці, гульні з цацкамі ("Конь-агонь", "Папяровы змей", "Кніжка-цацка", "Калейдаскоп", "Кубік-рубік", "Ліхтарык", "Алавяныя салдацікі", "Бінокль", "Тамагочы"). Так, кніжка з малюнкамі пра ракету і розныя планеты выклікае ў хлопчыка жаданне "усё, / Што бачыў, / Яваю зрабіць, / Няйначай" ("Кніжка-цацка") [6, с. 15], спасцігнуць свет не толькі ў тэорыі, але і на практыцы.

Кастусь Жук у кнізе "Бегемот без ботаў" (2004) паказвае вялікае значэнне сям'і (дачка просіць у бацькоў "купіць малютку") ("Сям'я"), вучыць сябраваць (ладзіць, не сварыцца, бо разам – дужыя) ("Сябры"), для працоўнага выхавання можна выкарыстоўваць верш "Кран", у якім хлопчык марыць стаць кранаўшчыком, каб будаваць прыгожыя дамы для людзей. Вершамі "Беларуская зіма" і "Родная мова" аўтар выхоўвае любоў да айчыны, а вершам "Гонар за брата" – жаданне абараняць яе, пайшоўшы ў войска. Паэт наглядна ілюструе неабходнасць высаджваць і берагчы лясы ("Зямныя лекары"), быць пісьменным ("Мішка і кніжка"), уважлівым і асцярожным ("Няўважлівы вожык"), ведаць правілы дарожнага руху ("Святлафор"), апісвае дзіцячыя хобі ("Малюнкі ў ахвоту", "Новы фотаапарат"), жывёлаў і што з імі здараецца ("Слон", "Парасяты", "Геша", "Малінаўка", "Жывы клубок", "Вярблюд"). Аўтар з гумарам распавядае, як хлопчык Кастусь разам з сабакам Лордам спявалі дуэтам – брахалі і завывалі ("Спевакі"). Акрамя вершаў паэт змясціў у кнізе вершаваныя скорагаворкі і загадкі. Скорагаворку "Якасная праполка" можна выкарыстоўваць для працоўнага выхавання дашкалятаў: "Поля ў полі / Бульбу поле, / Зелле носячы ў прыполе. / Колькі б, дожджык, / Ты ні ліў – / Не ўзрастуць там / Хвошч, палын..." [7, с. 65].

У кнізе "Два сонцы" (2004) Алесь Каско параўноўвае слова з зернем і заклікае паэтаў: "Засяваць умейце: / зернейкі-насенне / ўважліва правейце; / бы вясновым сонцам, / сэрцам іх сагрэйце. / Сейце" ("Чысты аркуш, або Градка-загадка") [8, с. 3]. У вершы "Два сонцы", што даў назву кнізе, паказваецца матуліна пяшчота, калі маці дачку называе сонцам. Яскравыя ў паэта апісанні прыроды, якая адухаўляецца і жыве сваім цікавым жыццём ("Золак", "Зялёны дождж", "Першы гром", "Снег"). Аўтар сімпатызуе дзецям-летуценнікам ("Пад ветразем", "Летуценнік"), іранізуе з тых, хто любіць выхваляцца ("Хвалько"), перажывае за здароўе фанатаў камп'ютэрных гульняў ("За камп'ютэрам"), спачувае курачцы, якая не ўмее лічыць да дзеся-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ці (“Курачка-квахтуха”). З гумарам апісвае сітуацыю, калі дзяўчынка з бабуляю спявала калыханку для сястрычкі, а пасля дзяўчынка спявала ўжо і для сястрычкі, і для бабулі (“Калыханка”). Распавядае, што хлопчык намаляваў бегемота на плоце, а ката – у балоце, і аргументаваў гэта актыўнасцю ці пасіўнасцю, любоўю ці нелюбоўю да працы: “– Часта можа быць і так: / дужа спрытны – бегемот / і лянівы надта – кот” (“Малюнак”) [8, с. 12]. “Вымаўлянкі” паэта карысныя для лагапедычных заняткаў па навучанні правільнаму вымаўленню пэўных гукаў, якія ў такіх творах часта паўтараюцца: “Перапёлка / мела занятак: / перапеляноўвала / перапелянятак” (“Перапёлка”) [8, с. 10].

Кніга “Павуцінка на агрэсце” Аксаны Данільчык (2005) знаёміць чытачоў з прыродай, вечна новай і вечна прыгожай, разнастайнай у яе сезонных зменах, вучыць быць назіральнымі і атрымліваць асалоду ад спасціжэння таямніцаў навакольнага свету. Вобразы паэткі, звязаныя з дзяцінствам, яскравыя і адчувальныя. Яны дапамагаюць выявіць дзіцячую наіўнасць, рамантычнасць, адкрытасць, здольнасць заўважаць дэталі, недаступныя позірку дарослага, жаданне зліцца з прыродай у адно цэлае, каб адчуваць яе сэрцам і спасцігаць розумам: “І тое шчасце сонечнага дня, / дзе сон дрыжыць сцюдзёнаю вадою / і белай пенай хваля сырадою / вось-вось, здаецца, выскачыць з вядра, / дзе басанож абыдзеш сто шляхоў / у пошуках суніц і дзікіх кветак / і дзе нястомна заклікае лета / паплысці да высокіх берагоў...” (“Юнаму чытачу”) [9, с. 3]. У вершах сустракаюцца яскравыя вобразы, небанальныя метафары і параўнанні: “За дрэваў сцяною на вузкай сцяжынцы / Кастрычнік стаіць – златарогі алень...” (“Дзяўчынка збірае кляновае лісце...”) [9, с. 27], “Лісцяў рубінавых час”, “Чуецца ў восеньскіх снах / Вечнага Моцарта крок...” (“Восеньскія сны”) [9, с. 27–28], “Плямкі святла і сунічныя шчочкі / Так упрыгожваюць мяккі імшанік, / Толькі збіраць іх даводзіцца моўчкі – / Таюць у роце за шарыкам шарык” (“Суніцы”) [9, с. 19].

Падводзячы вынікі, хочацца адзначыць высокі мастацкі ўзровень твораў, іх жывапісна-дакладную апісальнасць, магчымасць лёгка запамінацца дзякуючы вершаванай форме, вялікае пазнавальнае і выхаваўчае значэнне, зместавую адпаведнасць пазначанаму ў кнігах дзіцячаму ўзросту, а таксама выключнае майстэрства ілюстрацый Н. Суставай, У. Гладкевіча, Р. Сустава, С. Рыжыкавай, Я. Ларчанкі, С. Волкава, В. Дударэнкі, В. Паўлаўца, І. Гардзіёнка – усё гэта моцна ўражвае юнага чытача і дапамагае фарміраванню яго духоўна-эстэтычнага свету. За што дзеці і іх бацькі вельмі ўдзячныя выдавецтву “Мастацкая літаратура”.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Чарняўскі М. На каго сварыўся гром : вершы і казкі : для малод. шк. узросту / М. Чарняўскі. – Мн. : Маст. літ., 2003.

2. Зуёнак В. Рэха : вершы, загадкі, пацешкі : для дашк. і малод. шк. узросту / В. Зуёнак. – Мн. : Маст. літ., 2003.

3. Марук У. Чыж вярнуўся з-за мяжы : вершав. падарожжа : для малод.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шк. узросту / У. Марук. – Мн. : Маст. літ., 2003.
4. Пісьмянкоў А. Мы з братам : вершы, казкі : для дашк. узросту / А. Пісьмянкоў. – Мн. : Маст. літ., 2003.
5. Паўлаў У. Згадка на дабро : вершы, забаўлянкі-пазнаванкі, загадкі, паэма-казка : для малод. шк. узросту / У. Паўлаў. – Мн. : Маст. літ., 2004.
6. Лукша В. Адзіны ў свеце край : вершы і казкі : для малод. шк. узросту / В. Лукша. – Мн. : Маст. літ., 2004.
7. Жук К. Бегемот без ботаў : Вершы. Загадкі. Скорагаворкі. Казка : для дашк. узросту / К. Жук. – Мн. : Маст. літ., 2004.
8. Каско А. Два сонцы : вершы, вымаўлянкі, казкі : для малод. шк. узросту / А. Каско. – Мн. : Маст. літ., 2004.
9. Данільчык А. Павуцінка на агрэсце : вершы : для сярэд. шк. узросту / А. Данільчык. – Мн. : Маст. літ., 2005.

# БЕЛАРУСКАЯ МУЗЫЧНА-АДУКАЦЫЙНАЯ ЛІТАРАТУРА Ў СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ МУЗЫКАНТАЎ

***Кузьмініч Мікалай Леанідавіч,*** *кандыдат педагагічных навук, першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сістэме падрыхтоўкі музыкантаў шырока выкарыстоўваецца разнастайная літаратура вучэбнага і вучэбна-метадычнага, навуковага і навукова-метадычнага, даведачнага і папулярнага зместу, а таксама хрэстаматыі, нотныя зборнікі, школы і інш. Уся гэтая друкаваная прадукцыя ў педагогіцы адносіцца да сродкаў навучання, якія з'яўляюцца важнейшым кампанентам педагагічнага працэсу. Ад колькасці і якасці шмат у чым залежыць яго эфектыўнасць. У савецкі перыяд беларускія навучальныя ўстановы сферы культуры і мастацтва пераважна выкарыстоўвалі друкаваныя сродкі навучання, падрыхтаваныя расійскімі навукоўцамі і выдадзеныя ў расійскіх выдавецтвах. Ва ўмовах пабудовы нацыянальнай сістэмы музычнай адукацыі ўзнікла неабходнасць прааналізаваць забяспечанасць музычна-адукацыйнага працэсу друкаванай прадукцыяй "айчыннай вытворчасці", высветліць яе месца сярод сродкаў музычна- педагагічнага працэсу.

Сродкі навучання (СН) – гэта "усе аб'екты і працэсы (матэрыяльныя і матэрыялізаваныя), якія служаць крыніцай навучальнай інфармацыі і інструментамі (уласна сродкамі) для засваення зместу навучальнага матэрыялу, развіцця і выхавання навучэнцаў". А сістэма сродкаў навучання – гэта "сукупнасць аб'ектаў, неабходных і дастатковых для рэалізацыі працэсу навучання ў дыдактычным цыкле (на ўроку, у ланцужку іх, а таксама і па-за ўрокамі)" [1]. Элементы сістэмы СН – гэта крыніцы навучальнай інфармацыі ці сродкі-інструменты, якія дапамагаюць навучэнцам засвоіць навучальнны